культуры и языка своих стран, так как во время их проведения посредством предоставления достижений в различных видах искусства происходит взаимопроникновение культурных эпох и образуется связь между прошлыми веками и современностью.

СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ:

1. Тихомирова, Г. Ю. Фестиваль как форма социально-культурной детальности [Электронный ресурс] / Г. Ю. Тихомирова // Вестник Таганрогского института имени А. П. Чехова – 2016. – Режим доступа: https: //cyberleninka.ru/article/n/festival-kak-forma-sotsialno-kulturnoy-deyatelnosti. – Дата доступа: 14.03.2020.

2. Нечаева, А. А. Историческая память Уэльса: проблемы конструирования национальной традиции / А. А. Нечаева // Уральский исторический вестник. – 2014. – №4. – С. 33-40.

3. Браун, В. Голубые книги 1847 [Электронный ресурс] / В. Браун // WaybackMachine: интернет-журнал – 2004. – Режим доступа: https://web.archive.org/web/20080108172352/http://www.llgc.org.uk/index.php?id =thebluebooks. – Дата доступа: 01.03.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гаевская А. А., БГУКИ, студент 114 группы
очной формы обучения
Научный руководитель – Котович О. В.,
старший преподаватель

## ГАЛОЎНЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ І МІФАЛАГІЧНЫЯ ПЕРСАНАЖЫ СВЯТА КАЛЯДЫ

Кожны рытуальна-абрадавы комплекс беларускага народнага календара мае свае асаблівасці, атрыбуты і свой сакральны сэнс. Але нязменным застаецца тое, што у цэнтры кожнага абраду, перш наперш,

стаяць людзі, якім ў рытуальным дзеянні адведзена асобная роля і прызначэнне. Даследчыкі традыцыйнай культуры А. Катовіч і Я. Крук сярод галоўных удзельнікаў абраду выдзяляюць тры групы: ―кола непасрэдных удзельнікаў (напрыклад, калянднікі, валачобнікі); кола тых, на каго было напраўлена рытуальнае дзеянне (на Масленіцу юнакам, якія не жаніліся ў зімовы Мясаед, прывязвалі драўляныя калодкі – знак грамадскай вымовы); кола тых, каго ―выключалі” з рытуальнага дзеяння (напрыклад, блізкія родныя не малі права амываць памерлага…)” [5, с. 164]. Акрамя таго, вялікая ўвага надавалася ўзросту і сацыяльнаму становішчу удзельнікаў абраду, напрыклад, ―...мужчына, не саздаўшы сваю сям‘ю да сарака гадоў, не меў права быць хросным бацькам. Як правіла, павівальнай бабкай магла быць жанчына, якая ужо не ўступала ў палавыя зносіны з мужам...” [5, с. 164].

Каляды – адно з галаўнейшых свят беларускага календара, якое стала сімвалічнай мяжой паміж старым і новым годам, якое ахоплівала даволі вялікі адрэзак часу, аб‘ядноўвала сем‘і і ўвесь вясковы люд, давала надзею на лепшае жыцце ў новым годзе, з‘яўляецца яскравым прыкладам таго, як падчас правядзення рытуальных дзеянняў былі задзейнічаны тыя або іншыя групы выканальнікаў калядных абрадаў.

Каляды распачынаюцца пасля шасцітыднёвага Піліпаўскага посту, у час якога і пачыналі рыхтавацца да свята: ―Падрыхтоўку да Зімовых святак трэба пачынаць у Піліпаўку… развучваннем песень, карагодаў, гульняў… карнавальнага адзення, падрыхтоўкай музыкі, масак і г.д.” [1, с. 181].

Першы дзень свята (Посная, Галодная куцця) лічыўся выключна сямейным. Людзі, якія па розных абставінах аказваліся далёка ад дома, імкнуліся своечасова завяршыць свае справы, каб абавязкова вярнуцца дамоў да вячэры. Лічылі, што калі будуць яны разам за святочным сталом, то разам і дружна пражывуць наступны год. Акрамя таго ведалі, што ―ў першы дзень Калядаў… ніхто з сям‘і не павінен без пільнай патрэбы выходзіць і выязджаць з дому – каб свойская жывёла заўсёды прыходзіла з поля ў двор” [2, с. 361].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Безумоўна, галоўнымі ―выканаўцамі” падчас Каляд былі калядоўшчыкі. На думку А. Катовіч і Я. Крука ―...кампанія пераапранутых калядоўшчыкаў была ні чым іншым, як гуртам душ памёрлых продкаў. ... Па вёсцы, не мінаючы ні адной хаты, хадзілі душы продкаў, каб завітаць да кожнага чалавека, кожнай сям‘і” [4, с. 42] Гэты абыход меў сакральны сэнс, які апісваецца ў кнізе ―Земляробчы каляндар”: ―У аснове калядавання як калектыўнага закляцця ляжыць уяўленне аб дзейнаснай сіле магічнага слова, імкненне чалавека змяніць навакольны свет, забяспечыць добры ўраджай і дабрабыт сям‘і…” [3, с. 27].

Гурт калядоўшчыкаў складаўся з шэрагу персанажаў, галоўнай з каторых, безумоўна, была ―Каза”, якую лічылі сімвалам багацця і ўрадлівасці, адраджэння сіл прыроды. Вельмі распаўсюджаны сярод калядоўшчыкаў быў вобраз ―Мядзведзя”. Нашы продкі лічылі яго сімвалам рода і дабрабыту [1, с. 40]. Таксама разам з астатнімі удзельнікамі гурта весяліў людзей ―Цыган”. Падарункі ён атрымліваў за тое, што ―варажыў”, танцаваў і спяваў. Маска ―Каня” была не вельмі распаўсюджана, на Палессі сустракалася маска ―Тура”, а ў іншых рэгіёнах – ―Быка” або ―Каровы”. Даследчыкі адносяць гэтыя маскі да архаічных, і звязваюць з культам пладавітасці [1, с.42].

Сярод гурта калядоўшчыкаў былі і персанажы-птушкі. Часцей за ўсё – ―Бусел”. У беларускай міфалогіі з буслом звязаны такія паняцці, як чысціня, шчасце і ўрадлівасць, мудрасць і даўгалецце. Напярэдадні Каляд, у час падрыхтоўкі, з дрэва выраблялі галаву бусла і прымацоўвалі яе да палкі. Хлопец, які выконваў ролю ―бусла”, трымаў гэтую палку і хаваўся пад прасцінай. Ён танцаваў, пацiху біў дзюбай гледачоў і ўсяляк весяліў іх [1, с. 38].

На Палессі, Віцебшчыне і Гродзеншчыне сустракаецца яшчэ адзін цікавы персанаж – ―Воўк”, ад якога хавалі дзяўчат, таму што ён жартоўна мог скрасці адну з іх. Тады хлопцы выкуплялі дзяўчынку, а ―Ваўка” выганялі з хаты [8, с. 41].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Быў сярод калядоўшчыкаў яшчэ адзін персанаж, якога ўсе вельмі баяліся. Гэта быў “Чорт”: “…адзенуць чорнае такое плацце, ліцо чорнае, даўней жа былі плацці чорныя, накруцяць ануч і зробяць такі, як хвост, прычэпяць іззаду і вядуць гэтага “чорта” [9, с. 43].

У вёсках, дзе асноўнае насельніцтва было каталіцкага веравызнання, калядныя абыходы рабілі “Тры каралі”. Хлопцы павінны былі атрымаць дазвол на хаджэнне па сваёй парафіі і заплаціць за гэта грошы. Яны звычайна апраналіся ў анёла, каралёў, д‘ябла, пастухоў [8, с. 41].

У кожнай вясковай сям‘і рыхтаваліся да прыходу калядоўшчыкаў: “Считалі за чэсць, чтоб прышлі казлы. Эта такі празьнік: есьлі казлы ня пабудуць у хаце – у цябе ня будзя нікакога празьніка” [1, с. 78]. Гаспадарам спявалі віншавальныя песні: “Спачатку спявалі гаспадару і гаспадыні, затым кожнаму члену сям‘і” [3, с. 28]. Хлопцам і дзяўчатам, якія ўжо маглі жаніцца, спявалі велічальныя песні: “У велічальнай песні той, да каго яна была звернута, атрымліваў хвалебную характарыстыку. Калі песня адрасавалася дзяўчыне на выданні – услаўлялася яе прыгажосць і працавітасць, хлопцу – апявалася яго адвага і спрытнасць” [3, с. 28]. Калядоўшчыкаў трэба было частаваць і адорваць, таму “дзяўчаты і жанчыны з самай раніцы завіхаліся каля печы, рыхтавалі ўсялякія сялянскія прысмакі…” [4, с. 40]. У кнізе “Земляробчы каляндар” зафіксавана: “Прадстаўленне заканчвалася ўзнагародай калядоўшчыкаў салам, каўбасой, пірагом ці грашыма, пасля чаго кампанія накіроўвалася ў наступную хату” [3, с. 26].

Калядоўшчыкі абыходзілі ўсю вёску, нікога не мінаючы, але ўсё ж такі, адно выключэнне было: “абмінуць тую хату, якую ў гэтым годзе напаткала вялікае гора – смерць каго-небудзь з дамачадцаў” [4, с. 43]. Збіральнік беларускага фальклора Р. Гамзовіч, апісваючы калядныя абходы на Брэстчыне, фіксіруе: “Надыходзячы да хаты, трэба спытацца, ці можна шчадраваць. Але склалася такая сістэма: калі ў хаце нехта хворы або жалоба па памерлым, яны не маюць права весяліцца і прымаць віншаванні, таму такія сем‘і і тыя, хто не хоча прыняць конікаў, выключаюць святло” [10].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Другім знакавым днём Калядаў быў дзень святкавання Шчодрай (Шчадрэц), Багатай (Багатуха), Тоўстай куцці ў ноч з 13 на 14 студзеня. У гэты вечар выконвалі абрад шчадравання. Як кажуць навукоўцы Я. Крук і А. Катовіч, ―яно ўяўляла сабой той самы абыход вёскі калядоўшчыкамі, аднак на гэты раз у склад гурту уваходзілі толькі дзяўчаты... дзяўчаты-―шчадрухі" спявалі тыя ж самыя песні, што і хлопцы-калядоўшчыкі на першую куццю" [4, с. 66]. У шматтомным выданні БНТ ―Земляробчы каляндар" знаходзім апісанне песень гэтай пары: ―Шчадроўкі істотна не адрозніваліся ад калядак… з'яўляючыся разнавіднасцю зімовай велічальна-віншавальнай песні". А. Лозка ў кнізе ―Беларускі народны каляндар" піша: ―Шчадравалі пад вокнамі і ў хатах, дзе славілі гаспадароў" [7, с. 46], што таксама даказвае, што ўсё абрадавае дзеянне было накіравана на ўсіх жыхароў вёскі.

Назаўтра раніцай (14 студзеня) выконвалі абрад ―Засеўкі". Зараз вёску абыходзілі не толькі моладзь і дарослыя, але і самыя маленькія. ―...вясковыя хлопчыкі...збіраліся ў невялікі гурт, вешалі цераз плячо торбачкі з зернем... і зноў-такі хадзілі па хатах з навагоднімі віншаваннямі" [4, с. 67]. Таксама ўсе іх песні выконваюцца дзеля гаспадароў хаты: ―Тэма такіх калядак адна – пажаданне гаспадарам добрага ураджаю і дастатку ў новым годзе" [3, с. 32].

Такім чынам, на прыкладзе шматэтапнага свята Каляды, мы разгледзілі ролю асноўных удзельнікаў свята: тых, хто выконвалі абрады калядавання, шчадравання і рытуальных ―засевак" падчас абыходу хат вёскі; тых, на каго былі накіраваны рытуальныя дзеянні (усіх членаў сям'і), і тых, каго ―абміналі" – хто ў гэтым годзе па нейкіх аб'ектыўных прычын ―выключаўся" з усеагульнага каляднага абыходу.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Валодзіна, Т. В. «Ядраное жыта гаспадара кліча...»: каляндарны год у абрадах і звычаях / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 358 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Жыцця адвечны лад: Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.

3. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Бел. навука, 2003.

4. Катовіч, А. Зімовыя святы : нарысы / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. – 119 с.

5. Котович, О. В. Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.

6. Ліцвінка, В. Святы і абрады беларусаў / В. Ліцвінка. – Мінск : Полымя, 2008. – 193 с.

7. Лозка, А. Ю. Беларускі народны каляндар / А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 2002. – 237 с.

8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.2. Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка і інш.; складальнік Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 910 с.

9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне. У 2-х кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; аўт. Ідэі Т. Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 608 с.

10. Будзьма беларусамі! Калядны карнавал ―Конікі" у Давыд-Гарадку [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://budz ma.by/news/kalyadny-karnaval-koniki-w-davyd-haradku-fotarepartazh.html. – Дата доступу : 15.01.15.

Галюк Е. Г., БГУКИ, студент 114 группы
очной формы обучения
Научный руководитель – Котович О. В.,
старший преподаватель

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ